# Сакавіцкія сустрэчы

29 сакавіка адбыўся III Форум арганізацый грамадзянскай супольнасці і ініцыятыўных груп Сакавіцкія сустрэчы 2019.

Гэта пляцоўка для абмену досведам паміж актыўнымі людзьмі арганізацый грамадзянскай супольнасці, дзейнасць якіх накіравана на пазітыўныя змены ў грамадстве.

Амаль 180 прадстаўнікоў арганізацый грамадзянскай супольнасці і ініцыятыўных груп грамадзян, донарскіх і міжнародных арганізацый, даследчыцкіх цэнтраў, органаў мясцовай улады і кіравання, бізнесу, СМІ, а таксама незалежных экспертаў і экспертак сустрэліся ў гасцінных прасторах Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Ё. Рау.

На Форуме працавалі Прастора кансультацый, Прастора даследаванняў, Прастора грамадзянскай актыўнасці, Прастора грамадзянскіх правоў, Прастора перспектываў і Дыскусійная прастора.

Пашанцавала прыняць удзел у гэтым форуме і спецыялістам «Цэнтра паспяховаха чалавека». Шмат цікавых сустрэч, прыемных знаёмстваў, каштоўных ведаў і пазітыўных эмоцый традыцыйна падаравалі Сакавіцкія сустрэчы 2019 усім удзельнікам.